**Міцуль Н.Я.**,
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЦЫМБАЛЬНАЙ ШКОЛЫ (1940—60-я гг.)

Цымбалы — шырока распаўсюджаны ў Беларусі музычны інструмент. Цымбальнае майстэрства з'яўляецца часткай высокаразвітай прафесійнай і самадзейнай народнай музычнай культуры. Мы звернемся да 1940—60-х гг., перыяду станаўлення і фарміравання беларускай прафесійнай цымбальнай школы. Крыніцамі для напісання артыкула паслужылі разнастайныя матэрыялы: газеты, часопісы, рэспубліканскія і цэнтральныя архівы, інтэрв'ю.

Да Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі існавала разгалінаваная сетка музычных навучальных устаноў. У час вайны матэрыяльныя каштоўнасці кансерваторыі, вучылішчаў, школ аказаліся знішчанымі. Пасля вайны пачалося іх аднаўленне. У 1945 г. у рэспубліцы дзейнічалі 11 дзіцячых музычных школ, 4 музычныя вучылішчы: у Мінску, Гомелі, Віцебску, Магілёве. 1940—60-я гг. звязаны з актыўнай дзейнасцю таленавітага выканаўцы, педагога, кампазітара, мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага народнага аркестра БССР, народнага артыста СССР, прафесара І.І.Жыновіча.

Галоўную мэту сваёй працы ён бачыў у выхаванні маладога пакалення беларускіх цымбалістаў, якія спалучалі б выдатнае валоданне інструментам з высокай культурай, былі падрыхтаванымі да самастойнай творчасці.

У 1950 г. у Белдзяржкансерваторыі адкрылася кафедра народных інструментаў, на якой клас цымбалаў выкладаў І.І.Жыновіч. Кафедра праводзіла работу па стварэнні падручнікаў, рэпертуарных зборнікаў.

Нягледзячы на шматлікія намаганні, масавае навучанне ігры на цымбалах яшчэ не атрымала тады



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырокага развіцця. У дзіцячай музычнай школе г.Мінска па класе цымбалаў, напрыклад, займаліся ўсяго 4 вучні.

У 1956 г. у Мінску адкрываецца дзіцячы дом з паглыбленым музычным і мастацкім навучаннем. Клас цымбалаў у ім вядзе выкладчык А.А.Астрамецкі.

На базе музычнай школы сельскагаспадарчай арцелі імя М.Гастэлы Мінскага раёна пачынаюць працаваць гадавыя падрыхтоўчыя курсы цымбалістаў, на якіх клас цымбалаў вядзе выкладчык З.Насценка. У перыферыйных школах рэспублікі клас цымбалаў тады адсутнічаў.

Прыёмным камісіям даводзілася залічваць у музычныя вучылішчы асоб са слабай падрыхтоўкай або зусім без яе. Праз чатыры гады яны павінны былі стаць артыстамі Беларускага дзяржаўнага аркестра або выкладчыкамі. У кансерваторыю на аддзяленне народных інструментаў у той час паступалі адзінкі.

Для далейшага развіцця музычнай культуры, паляпшэння музычнай адукацыі ў 1958 г. Міністэрствам культуры БССР былі здзейснены практычныя крокі. Абласныя ўпраўленні культуры разгарнулі работу па стварэнні ў абласцях цымбальных аркестраў. Быў павялічаны прыём навучэнцаў па класе цымбалаў у кансерваторыю на 5 чал., у музычнае вучылішча — на 6 чал.

Абласныя ўпраўленні культуры пачалі арганізоўваць у буйных гарадах майстэрні па рамонце і настройцы музычных інструментаў.

У канцы 1950-х гг. арганізуюцца вячэрнія музычныя школы пры музычных вучылішчах, музычныя студыі пры клубах і Дамах культуры; пры Мінскай музычнай школе ствараюцца 11-месячныя курсы цымбалістаў на 32 чал.

У 1962 г. закончылі спецыяльныя вучэбныя ўстановы па класе цымбалаў (з адрывам ад вытворчасці) усяго 16 чал. З-за адсутнасці выкладчыкаў Міністэрства культуры вымушана было абмежаваць прыём навучэнцаў у дзіцячыя музычныя школы ў 1961/62 навуч. г.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыпыніць адкрыццё новых дзіцячых музычных школ. У сувязі з гэтым Савет Міністраў БССР прапанаваў штогод на працягу 1964—70 гг. прымаць у кансерваторыю па класе цымбалаў не менш за 6—8 чал., а таксама павялічыць прыём у музычныя вучылішчы.

У дзіцячых музычных школах Мінскага раёна і вобласці ў тым жа 1962 г. клас цымбалаў практычна адсутнічаў.

Фарміраванню сістэмы адукацыі цымбалістаў перашкаджала і малая колькасць інструментаў. У 1948 г. у сваім артыкуле “Цымбалы” І.І.Жыновіч пісаў: “У самадзейным мастацтве, як і раней, ужываюцца старыя цымбалы, на якіх можна іграць толькі народныя песні і танцы ў прымітыве. Удасканалены інструмент зусім невядомы шырокім масам удзельнікаў мастацкай самадзейнасці”.

На фабрыцы піяніна ў Барысаве выраб цымбалаў пачаўся яшчэ ў 1937 г., але да 1959 г. фабрыка не мела цэха для гэтага вытворчага працэсу. Невялікія партыі цымбалаў перыядычна выраблялiся на пляцоўках асноўнай вытворчасці.

Не абышлося тут і без кур’ёзных выпадкаў. Так, перад Другой дэкадай беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве фабрыка піяніна ўзяла на сябе абавязацельствы поўнасцю забяспечыць патрэбы нашай рэспублікі ў цымбалах. Было выраблена 1200 інструментаў. Не вывучыўшы попыт пакупніка, гандлёвыя арганізацыі ўзялі з фабрыкі толькі 400 адзінак. Астатнія на доўгі час засталіся ляжаць на складзе. Такім чынам, 800 новых цымбалаў сталі непрыдатнымі для выкарыстання.

У 1965 г. Міністэрства культуры выдзяляе асігнаванні для набыцця 60 камплектаў аркестраў народных інструментаў.

У друку тых гадоў пастаянна з’яўляюцца скаргі на нізкую якасць выраблены інструментаў. І.І.Жыновіч не аднойчы паведамляў кіраўніцтву фабрыкі пра недахопы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструмента. Паступова цымбалы ўдасканальваюцца: павялічваецца іх дыяпазон, мяняецца размяшчэнне падставак, памер галаснікоў. У канцы 1960-х гг. удасканаленыя інструменты становяцца папулярнымі ў музычных колах Беларусі і за яе межамі.

Цымбалы выраблялiся таксама і майстрамі-самавукамі. Між іншым, адной з асаблівасцей цымбальнага мастацтва з'яўляецца арганічная сувязь майстэрства вырабу цымбалаў з музычна-выканальніцкай практыкай. Амаль усе майстры адначасова былі прафесійнымі цымбалістамі. Гэта дазваляла глыбей спазнаць прыроду інструмента, абумоўлівала яго высокую якасць.

Для дзяржаўнага аркестра народных інструментаў, салістаў-выканаўцаў інструменты вырабляў У.Крайко. У самадзейных калектывах гэтую праблему вырашалі майстры, якія ігралі ў цымбальных аркестрах, сямейных ансамблях. І.Лычкоўскі з г.Чэрвеня Мінскай вобласці, напрыклад, змайстраваў 9 цымбалаў. У перыядычным друку тых гадоў часта ўзгадваецца імя майстра, калгаснага музыканта са Старобінскага раёна, Хв.Рамановіча, які больш за трыццаць гадоў іграў на скрыпцы, цымбалах. Жыхар вёскі Зевіна Вілейскага раёна І.Бохан змайстраваў цымбалы, якія атрымалі высокую ацэнку на абласной выставе работ самадзейных майстроў.

Развіццю цымбальнай выканальніцкай школы, масаваму распаўсюджванню цымбалаў у 1940—60-я гг. садзейнічала і наступнае. Перш за ўсё гэта выданне метадычнай літаратуры ў дапамогу выкладчыкам дзіцячых музычных школ і мастацкай самадзейнасці. Папулярнымі былі выданні “Школа для беларускіх цымбалаў” (1948), “Дзяржаўны беларускі народны аркестр” (1958), “Аркестр цымбалістаў” (1968). У гэтых працах даюцца падрабязнае апісанне цымбалаў розных відаў, іх магчымасцей, выканальніцкіх прыёмаў, парады па арганізацыі беларускіх аркестраў народных інструментаў.

У 1957 г. у рэспубліцы былі арганізаваны тэматыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя радыёперадачы да Усесаюзнага фестывалю. Кожная перадача суправаджалася тлумачальным тэкстам, у канцы яе даваліся парады метадыстаў.

У пачатку 1950-х гадоў быў вельмі абмежаваны рэпертуар прафесійных і самадзейных калектываў. Аб гэтым сведчыць артыкул А.Змачынскага. Аўтар адзначае, што беларускі рэпертуар бедны, выканаўцы вымушаны на ўсіх канцэртах, выступленнях па радыё з году ў год паўтараць адны і тыя ж нешматлікія творы. Гэта надакучыла і выканаўцам, і слухачам. Яны настойліва патрабуюць ад беларускіх кампазітараў папоўніць інструментальны жанр новымі творамі. З гэтай мэтай на "серадах" у Саюзе кампазітараў БССР І.Жыновіч дэманстраваў тэмбравыя і тэхнічныя магчымасці цымбалаў на прыкладзе твораў Дз.Камінскага, М.Аладава. Вось найбольш вядомыя творы таго часу: "Першы канцэрт для цымбалаў і аркестра", варыяцыі на беларускую тэму "Восень" Дз.Камінскага, "Канцэрт для цымбалаў" І.Ронькіна, "Канцэрціна для цымбалаў" Я.Глебава і інш.

1950-я гады прыносяць першыя значныя дасягненні. На прафесійнай сцэне паспяхова выступае квартэт цымбалістаў у наступным складзе: І.Жыновіч, С.Навіцкі, Х.Шмелькін, У.Самсонаў. Сярод вядомых музыкантаў Беларусі прыметнае месца займае А.Астрамецкі. Дуэтам выступаюць Х.Шмелькін, С.Навіцкі. На Днях беларускай культуры ў Маскве яны робяць запісы беларускай музыкі да першых гукавых фільмаў.

У 1953 г. ім прысвоена ганаровае званне заслужаных артыстаў рэспублікі. На Сусветным і Усесаюзным конкурсах званні лаўрэатаў атрымалі В.Бурковіч, М.Шмелькін. Дзяржаўны аркестр народных інструментаў стаў лаўрэатам Усесаюзнага конкурсу.

На працягу 1940—60-х гг. адбываюцца змены і ў мастацкай самадзейнасці. Спачатку цымбалы сустракаліся галоўным чынам у сямейных ансамблях (напрыклад, ансамблі сем'яў Бурковічаў, Бенькаў, Барадаўкаў, Андрушкевічаў, Лямбовічаў). У 1945 г. пасля рэспу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бліканскага агляду ў прафесійнае мастацтва перайшлі 12 чал., з іх 4 — выканаўцы на баяне, цымбалах. Музыканты сталі салістамі Ансамбля беларускай народнай песні і танца Палескай вобласці.

Пазней на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці быў арганізаваны семінар цымбалістаў і самадзейных кампазітараў Мінскай вобласці. На ім упершыню былі разгледжаны пытанні стварэння цымбальных аркестраў, падрыхтоўкі выканаўцаў, пашырэння рэпертуару, набыцця інструментаў. Быў зроблены разбор 25 твораў самадзейных кампазітараў. Выступіў аркестр пад кіраўніцтвам М.Барадаўкі з Асіповіцкага раёна.

Паступова фарміруюцца цымбальныя аркестры ў Смаргонскім раёне (кіраўнікі А.Дзяруга, Р.Жабінскі), Пастаўскім раёне (кіраўнік К.Кравенка), Магілёўскай вобласці (кіраўнікі Л.Смарадава, Л.Зноман). Кожны з калектываў вылучаўся самабытнасцю манеры выканання, адметным гучаннем інструментаў.

**Фесюк А.М.,**
*аспірант кафедры харэаграфіі*

## ПРАБЛЕМЫ ЎВАСАБЛЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТЭМАТЫКІ НА БЕЛАРУСКАЙ БАЛЕТНАЙ СЦЭНЕ

Слова “фальклор” у апошнія гады стала модным. Па ўсёй рэспубліцы арганізуюцца фальклорныя фестывалі, святы, канцэрты (фестываль нацыянальных культур у Гродне, фестываль аўтэнтычнага фальклору на Магілёўшчыне, фестываль беларускай полькі і інш.). Тэмы і вобразы фальклору папулярныя ў розных галінах, ад тэлевізійных мюзіклаў да выставачнага дызайну і мастацкага мадэліравання вопраткі. Папулярным становіцца і тып традыцыйнага фальклорнага кантакту ў непасрэдных святочна-творчых зносінах, прасторы свята — гульні. Там

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ